Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

22 КРАСАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР

№ 75 (29444)

ЗВЯЗДА

КЛЯШЧЫ НЕ ДРЭМЛЮЦЬ 5

ГІСТОРЫЯ АДНАГО ПЕРАКЛАДУ 10

Сустрэча ў Маскве

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёння здзяйсняе рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У Маскве запланаваны сустрэча і перагаворы кіраўніка нашай краіны з яго калегам Уладзімірам Пуціным. Лідары абмяркуюць актуальны парадак дня беларуска-расійскіх адносін, традыцыйна спыніўшыся на актуальных пытаннях гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяркуюць сумеснае рэагаванне на актуальныя выклікі і пагрозы, абмяняюцца думкамі па тэматыцы міжнароднага парадку дня, сітуацыі ў рэгіёне.

Разгледжана на сесіі

АБАРАНЯЦЬ І ПАПЯРЭДЖВАЦЬ

Савет Рэспублікі ўхваліў законапраекты аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму, папраўкі ў законы па пытаннях процідзеяння экстрэмізму, змены Закона аб масавых мерапрыемствах і іншыя заканадаўчыя акты, якія датычацца дзяржаўнай аховы і нацбяспекі.

Сенатары на пасяджэнні пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання ўхвалілі некалькі законапраектаў, змены ў якія выкліканы падзеямі другой паловы мінулага года. Пачнём з галоўнага — аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму.

— Гэты законапраект — складнік комплексу мер, накіраваных на тое, каб карэннym чынам спыніць гэтыя праявы. Трэба разумець, што ў сітуацыі, якая ў пэўным становішчы праявы нацызму, — гэта элемент той вайны, якая вядзецца з Рэспублікай Беларусь. Яе называюць гібрыднай, інфармацыйнай, але асноўная мэта — гэта захоп улады, знішчэнне незалежнай Беларусі, — падкрэсліў **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД.**

Ён адзначыў, што неаднасцыйся арганізацыі — адзін з элементаў радыкалізацыі тых праяў, якія адбываюцца, пачынаючы са жнівня мінулага года.

— І наш з вамі святы абавязак, звязаны з гарантаваннем бяспекі і стабільнасці ў нашым грамадстве, — спыніць любыя праявы нацызму і тым больш рэабілітацыі нацысцкіх злачынстваў, — сказаў генпракурор.

Трэба адзначыць, што гэты законапраект з'яўляецца прынцыпова новым для беларускай прававой сістэмы: дагэтуль асноўным заканадаўчым актам, які рэгулюе пытанні супрацьдзеяння гэтай з'яве, з'яўляецца Закон «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму».

Так, упершыню замацоўваюцца новыя тэрміны і азначэнні: у прыватнасці, уводзяцца тэрміны «нацысцкія злачынцы» і «памагатыя нацысцкіх злачынстваў». Вызначаюцца суб'екты супрацьдзеяння рэабілітацыі нацызму, іх кампетэнцыя, замацоўваюцца прафілактычныя меры і меры супрацьдзеяння рэабілітацыі нацызму. Таксама замацоўваецца забарона рэабілітацыі нацызму і яго фінансаванне, дзейнасць суб'ектаў, накіраваная на рэабілітацыю нацызму, прапаганда, публічнае дэманстраванне і іншыя дзеянні, звязаныя з выкарыстаннем нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі.

АБАРОНА АД ХЛУСНІ

На пасяджэнні сесіі сенатары таксама пагадзіліся з папраўкамі ў законы па пытаннях процідзеяння экстрэмізму.

— Для нас вельмі важна, што Савет Рэспублікі ўхваліў законапраект, накіраваны на супрацьдзеянне экстрэмізму. Тыя прапановы і навелы, якія ў ім замацаваны, ідуць ад жыцця, ад асноўнай абароны нашай краіны, суверэнітэту, нашай тэрытарыяльнай цэласнасці, — падкрэсліў у размове з журналістамі генеральны пракурор Андрэй Швед.

Паводле яго слоў, пры падрыхтоўцы законапраекта ўлічваўся міжнародны вопыт.

— Тыя нормы, якія замацаваны ў законапраекце, прадугледжваюць комплекс збаланса ваных мер. Гэта захады прафілактычнага, папераджальнага і карнага характару.

Гэта значыць, дзяржава прымае ўсе магчымыя меры, не толькі каб караць, але ў першую чаргу і прафілактаваць, выяўляць, і, толькі калі ўжо прыняты меры, вырашаць пытанне аб адказнасці гэтых асоб, — адзначыў генпракурор. СТАР. 2

Вілейскі аўтасалон

Міхаіл КРЫВАТУЛАЎ — заўзяты аўтамабіліст з вялікім стажам. Па-першае, кожны дзень ён за абаранкам аўталаўкі — развозіць прадукты па вёсках Вілейскага раёна і гэтым зарабляе на жыццё, на сям'ю, дарэчы, шматдзетную. А па-другое... Менавіта дзеля гэтага другога я і сустрэўся з вілейскім жыхаром, і не дзеля нябудзь, а ў адмысловым «аўтапарку», які месціцца ў звычайнай гарадской кватэры на пятым паверсе. Наша сустрэча прайшла ў атачэнні аўтамабільных рарытэтаў савецкага аўтапрама, а таксама постсавецкага перыяду. Я не ведаю другога аматара, які б сабраў столькі міні-мадэляў — прадстаўнікоў усяго спектра айчынных аўто. Міхаілу было што паказаць, а пра сваё нібыта цацачнае захапленне ён мог бы распавядаць гадзінамі.

Калекцыянеру сорак адзін год. Трыццаць з іх ён вывучае гісторыю аўтамабільнай тэхнікі і збірае мінімашыны. У новай кватэры на адмысловых стэлажах — каля сямісот мадэляў. Некалькі разоў распраздаваў раней шыя «зборы» і пачынаў па-новаму. «Усё не ахапіць, трэба вызначацца, што табе цікавей», — кажа калекцыянер і паказвае канцэпцыю новага аўтапарка, які расцягнуўся на ўсю сцяну пакоя: асобна пасажырскі транспарт, побач — калекцыя бартавых — самазвалаў, велікагрузных і аўтацягнікоў, спецыяльных, тыпу малакавозаў, хлебавозак, прадуктовых, «лятучак» ды іншых. Лінейка легкавых усіх пакаленняў, асобны «гараж» для спецтэхнікі — краны, пажарныя машыны, бетонамяшалкі.

На жаль, немагчыма паказаць на адным фота праект Міхаіла Крыватулава ў поўным аб'ёме, але яго можна пабачыць на нашым сайце zviazda.by.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ШПАРЛО, начальнік дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:

«У аснову дзяржаўнай палітыкі па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы закладзены пераход ад пасляаварыйных рэабілітацыйных мерапрыемстваў да развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу пацярпелых рэгіёнаў. Прыярытэтамі з'яўляюцца газіфікацыя населеных пунктаў, развіццё водаправодных сетак, добраўпарадкаванне, уключаючы будаўніцтва дарог, жылля, аб'ектаў аховы здароўя, адукацыі, рэалізацыя інвестыцыйных праектаў».

Перспектыва

СПЛАЎ МАЛАДОСЦІ І МУДРАСЦІ

Як у «Кухчыцах» рыхтуюць змену

Адкрытае акцыянернае таварыства «Кухчыцы», што ў Клецкім раёне, даволі моцнае ў плане сацыяльна-эканамічнага развіцця. Асноўныя віды прадукцыі, якія выпускаюцца ў гаспадарцы, — малако, ялавічына, зерне, цукровыя буракі, кукуруза, рапс і бульба. З кожным годам паказчыкі паляпшаюцца. Напрыклад, летась валавы надой малака склаў 10 746 тон, прыбаўка да 2019-га — 1841 тона. Сярэдні надой на карову — на ўзроўні 7212 кілаграмаў, да папярэдняга года слюсавалі на 1032 кг. У планах на гэты год дасягнуць надою у восем тысяч. Сортам «экстра» рэалізавана 80,5 % малака, прырост да 2019-га — 20,4 %.

Дырэктар ААТ «Кухчыцы» Сяргей ЗДРОК.

СТАР. 3

Пасля Чарнобыля

Брагінскія кавуны з прыстаўкай «эка-»

На Гомельшчыне актыўна рэалізоўваюцца праекты па развіцці тэрыторый, пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС. Адзін з дзейсных механізмаў — навучанне мясцовых жыхароў асновам прадпрымальніцкай дзейнасці, звязаной з сельгасвытворчасцю, вядзеннем агратурызму. Выдатныя прыклады па ўкараненні падобнай практыкі ёсць на Брагіншчыне. Так, менавіта ў гэтым раёне пачаў працаваць першы аграбізнес-інкубатар Гомельшчыны.

Ініцыятыва аказалася настолькі запатрабаванай, што значная колькасць сем'яў раёна цяпер імкнецца паспрабаваць свае сілы ў прыватнай сельгасвытворчасці. Можна казаць аб актыўным развіцці фермерскага руху на Брагіншчыне. Сярод тых, хто распачаў новую дзейнасць, і Вольга ДАРАХАВЕЦ. Сёлета яна закладвае ўчастак па вырошчванні буякоў. Саджанцы перадалі супрацоўнікі мясцовага фонду падтрымкі прадпрымальніцтва і сельскага развіцця «Эка-Інавацыя». Гэтыя ягады жанчына ўжо вырошчвала, атрымлівалася зусім нядрэнна, цяпер плануе працягваць займацца і бахчавымі. Частку свайго прысядзібнага ўчастка Вольга адвяла пад кавуны і моркву. Дарэчы, яе плантацыя кавуноў стане адной з дэманстрацыйных сельгаспляцовак, якія змогуць матываваць жыхароў раёна брацца за культывацыю згаданай культуры.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Уладзімір Пуцін пракаментаваў інфармацыю пра спробу дзяржаўнага пераваротаў Беларусі

Прэзідэнт Расіі падчас пасяджэння Федэральнаму сходу пракаментаваў інфармацыю пра спробу дзяржаўнага пераваротаў Беларусі, паведамляе ТАСС. Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што ў апошні час практыкі палітычна матываваных незаконных санкцый і спробы асобных дзяржаў навязаць сваю волю іншым сталі штодзённасцю. «Але сёння падобная практыка перараджаецца ў нешта больш небяспечнае. Маю на ўвазе факты прамой спробы арганізацыі ў Беларусі дзяржаўнага пераваротаў і забойства прэзідэнта гэтай краіны, якія сталі нядаўна вядомыя. Пры гэтым характэрна, што нават такія абуральныя дзеянні не знаходзяць асуджэння так званага калектыўнага Захаду. Ніхто гэтага проста як быццам бы і не заўважае, усе робяць выгляд, што наогул нічога не адбываецца», — адзначыў Прэзідэнт Расіі. Планы па арганізацыі дзяржаўных пераваротаў і забойства вышэйшых службовых асоб, як у выпадку з прэзідэнтам Беларусі, недапушчальныя, па-за залежнасцю ад стаўлення да палітыкі беларускага лідара, падкрэсліў Уладзімір Пуцін. Ён таксама адзначыў, што прызнанні ўдзельнікаў змовы з мэтай змены ўлады ў Беларусі сведчаць аб падрыхтоўцы масіраванай кібератакі на краіну. «Чаго толькі вартыя прызнанні затрыманых удзельнікаў змовы ў тым, што рыхтавалася блакада Мінска, уключаючы гарадскую інфраструктуру і сродкі камунікацыі, поўнае адключэнне ўсёй энергасістэмы сталіцы Беларусі», — заўважыў расійскі лідар.

Азіяцкія рынкі ўстрывожаны з-за ўспышкі пандэміі

Рынкі занепакоены рэзкім павелічэннем колькасці новых заражэнняў на азіяцкіх прасторах ад Японіі да Індыі. Яны ўжо паўтара месяца адстаюць ад калег на іншых кантынентах. Валюты дзяржаў, ахопленых вірусам, паказваюць значна ніжэйшыя вынікі ў параўнанні з краінамі, дзе вакцынацыя ідзе поўным ходам. Найбольш наглядна наступствы пагаршэння эпідэмічнага становішча на планеце выявіліся ў выглядзе падзення на працягу некалькіх дзён запар акцый амерыканскіх кампаній. «Рынкі занадта супакоіліся і размяклі пасля аднаўлення гандлю, — заўважыў кіраўнік Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна ў BNP Paribas Asset Management Пол Санду. — Успышка COVID-19 і яго мадыфікацый пагражае паслабленню і зняццю сацыяльных абмежаванняў. Рынкі з высокім узроўнем вакцынацыі пераносяць гэтыя рызыкі не так цяжка, як краіны, дзе вакцынацыя праходзіць павольна». Як вядома, Сусветная арганізацыя аховы здароўя днямі заявіла, што колькасць новых заражэнняў расце паўсюль, акрамя Еўропы. Найбольшы рост колькасці хворых на COVID-19 зафіксаваны ў Азіі.

У Літве выявілі невядомую мутацыю каранавіруса



Невядомая мутацыя зафіксавана ў літоўскім горадзе Анікшчай. Пра гэта ў эфіры нацыянальнага радыё паведаміла дырэктар рэгіянальнага дэпартамента Нацыянальнага цэнтра грамадскага здароўя Бірутэ Сапкаўскенэ, паведаміла ТАСС. «У ранейшым цэнтры Анікшчай зафіксавана некалькі дзясяткаў выпадкаў каранавіруса, выкліканага мутацыяй, якая не звязана з брытанскім, паўднёваафрыканскім або іншым вядомым нам штамам», — заявіла Бірутэ Сапкаўскенэ. Паводле яе слоў, у іншых месцах Літвы гэтая разнавіднасць мутацыі каранавіруса не выяўлена. «Каля траціны людзей, якія былі носьбітамі гэтага штама, ужо паправіліся», — адзначыла эксперт. Большасць з іх перахворала бессімптомнай формай, некалькі чалавек было шпіталізавана. «Нічога незвычайнага як быццам няма. Даных аб тым, што зафіксаваная разнавіднасць асабліва агрэсіўная ў сэнсе перадачы ад чалавека чалавеку, не атрымана. Неабходны далейшыя назіранні», — заўважыла Бірутэ Сапкаўскенэ.

КАРОТКА

- **Наведаць могілкі ў зоне адчужэння без пропускаў можна будзе 8–11 мая.**
- «Беларускалій» пачаў асноўны этап праходкі на Дарасінскім рудніку.
- **Мабільная экспазіцыя музея ВАВ будзе працаваць з 1 мая ў гарадскіх парках Мінска.**
- «АМКАДОР» пачаў выпрабоўваць сеялку новага пакалення.



- У Мінску на Радаўніцу арганізуюць бясплатны ўезд аўтамабіляў на могілкі.
- На аэрадроме Мачулішчы абнаўляюць узлётна-пасадачную паласу.
- Тэрмін падачы заяў у ваенныя навучальныя ўстановы працягнуты да 7 мая.

Спецыяльны рэпартаж

Дружыннікі выходзяць на дзяжурства...

...а разам з імі — і карэспандэнт «Звязды»

Маскоўскае РУУС Мінска. На гадзінніку 18 вечара. Менавіта ў гэты час да службы разам з супрацоўнікамі міліцыі заступаюць на дзяжурства дружыннікі, усіх — 24 чалавекі. Кожны замацаваны за сваім участковым, у кожнага свая зона адказнасці. Ёсць і студэнты, і тыя, хто працуе на сталічных прадпрыемствах. Усе яны дасведчаныя, але штораз перад новым заданнем, па пятніцах і суботах, для іх праводзіцца інструктаж.

— За нашым РУУС замацаваны больш за 300 дружыннікаў. Раз на паўгода праводзіцца зверка — тыя, хто па якіх-небудзь прычынах выходзяць з дружыны, замяняюцца новымі добраахвотнікамі, — кажа **старшы інспектар аддзела аховы і правапарадку, Ігар ЯНЧАНКА.** — Бяром усіх, хто трапляе пад пэўныя крытэрыі: грамадзяне Беларусі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, здольныя па сваіх дзелавых і маральных якасцях, стане здароўя ажыццяўляць дзейнасць па ўдзеле ў ахове правапарадку. СТАР. 3

Нечаканая сустрэча міліцыянера і даўно знаёмага яму мужчыны.

ISSN 1990 - 763X

АБАРАНЯЦЬ І ПАПЯРЭДЖВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У прыватнасці, замацоўваюцца новыя тэрміны і іх вызначэнні, а таксама ўдакладняюцца існуючыя. Так, уводзяцца паняцці «экстрэмісцкая сімволіка і атрыбутыка» і «экстрэмісцкае фарміраванне». Пашыраюцца вызначэнні тэрмінаў «экстрэмізм» (экстрэмісцкая дзейнасць) і «экстрэмісцкія матэрыялы». Да экстрэмісцкіх матэрыялаў прапануецца адносіць не толькі інфармацыйную прадукцыю, але і сімволіку і атрыбутыку экстрэмісцкіх арганізацый.

Да экстрэмізму будуць адносіцца таксама публічныя заклікі да арганізацыі і праявядзення масавых мерапрыемстваў у парушэнне вызначанага парадку іх арганізацыі і праявядзення, а таксама ўцягненне ў іх грамадзян; садзейнічанне ажыццяўленню экстрэмісцкай дзейнасці, навучанне ці падрыхтоўка для ўдзелу ў такой дзейнасці; распаўсюджванне хлуслівых звестак, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь і інш.

Важна: замацоўваецца новы механізм супрацьдзеяння экстрэмізму. На МУСускладваюцца паўнамоцтвы па вядзенні і публікацыі пераліку арганізацый, фарміраванні, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян, якія маюць адносіны для экстрэмісцкай дзейнасці. Вызначаюцца падставы ўключэння ў такія пералікі, забарона на асобныя віды дзейнасці (напрыклад, пазбаўленне права займацца педагагічнай і выдавецкай дзейнасцю, займаць дзяржаўныя пасады, праходзіць вайсковую службу), а таксама падставы для выключэння асоб з такіх пераліку. Дарэчы, фінансавыя аперацыі грамадзян, якія трапілі ў гэты спіс, павінны знаходзіцца на асаблівым кантролі.

З навел — скарачэнне тэрміну разгляду ў судзе матэрыялаў з прыкметамі экстрэмізму ў адносінах да арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў: максімальны тэрмін разгляду зараз будзе складаць месяц.

ТОЛЬКІ ДАЗВОЛЬНЫ ПРЫНЦЫП

Сенатары на пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі таксама ўхвалілі законапраект «Аб зменах Закона Беларусі «Аб масавых мерапрыемствах у Беларусі».

— Змены ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах» прадыктаваны часам і практыкай выкарыстання, — падкрэсліў у размове з журналістамі **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.** — У новым законапраекце скасоўваецца паведамляльны прынцып, калі дастаткова было паведаміць у органы ўлады. Мы ўнеслі змены. На сёння ў абавязковым парадку павінен быць дазвольны прынцып, то-бок заяўны. Чаму гэта было зроблена? Другая палова 2020 года паказала, што асобныя грамадзяне Беларусі, а менавіта дэструктыўна настроеныя сілы, выкарыстоўвалі гэтую норму для збору грамадзян. Потым у пэўны момант выводзілі людзей на вуліцы, падчас масавых беспарадкаў здзяйснялося злачынствы, у тым ліку сяржыя і асабліва сяржыя.

Міністр падкрэсліў, што пры падрыхтоўцы законапраекта вывучаўся міжнародны вопыт, у тым ліку Расійскай Федэрацыі.

Прадугледжваецца, што разам з месцамі, у якіх правядзенне масавага мерапрыемства забаронена, выканкамы будуць вызначаць месцы, рэкамендаваныя для правядзення мерапрыемства.

На журналістаў СМІ, якія прысутнічаюць на масавым мерапрыемстве, распаўсюджваюцца тыя ж патрабаванні па захаванні грамадскага парадку, якія дзейнічаюць для яго арганізатараў і ўдзельнікаў.

Уводзіцца забарона на асвятленне ў СМІ, інтэрнэце і іншых інфармацыйных сетках у рэжыме рэальнага часу масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца з парушэннем вызначанага парадку, з мэтай іх папулярызацыі ці прапаганды.

Забараняецца збор, атрыманне і выкарыстанне грошай і іншай маёмасці на пакрыццё выдаткаў, звязаных з прыцягненнем да адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі і праявядзення масавых мерапрыемстваў.

ПРАВА НА АХОВУ

Сенатары падтрымалі законапраект «Аб зменах Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай абароне суддзяў, службовых асоб праваахоўных і кантралюючых (наглядных) органаў, супрацоўнікаў органа дзяржаўнай аховы».

— Змены ў закон прадыктаваны часам. Пагрозы ў канцы мінулага года, ды і ў пачатку гэтага года паступалі на адрас службовых асоб у сувязі з выкананнем імі службовых абавязкаў. Але не толькі ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў альбо ў дачыненні да суддзяў, але і ў дачыненні да проста асоб з грамадзянскай пазіцыяй — настаўнікаў, артыстаў, журналістаў — таксама паступала вялікая колькасць пагроз. Таму ў заканадаўстве ўнесена паняцце, як іншыя асобы, якіх ахоўваюць, — патлумачыў міністр унутраных спраў Іван Кубракоў.

Паводле яго слоў, любы грамадзянін, у дачыненні да якога паступаюць пагрозы, звяртаецца ў органы ўнутраных спраў. У сваю чаргу яны вызначаюць ступень пагрозы.

— З улікам гэтага і вызначаецца ступень абароны. Камусьці дастаткова, магчыма, проста змяніць месца работы ці месца жыхарства, а камусьці неабходны змены знешнасці. Якія меры абароны выкарыстоўваць да той ці іншай асобы, будуць вырашаць супрацоўнікі органаў унутраных спраў на падставе аналізу тых пагроз, якія паступаюць, — патлумачыў міністр.

Ён падкрэсліў, што такія меры абароны будуць выконвацца за дзяржаўныя сродкі.

Трэба сказаць, што законапраектам замацоўваецца магчымасць выкарыстання такой меры бяспекі, як змена знешнасці, не толькі ў адносінах да асоб, якіх ахоўваюць, але і ў адносінах да іх блізкіх.

Таксама прадугледжанае абавязковае дзяржаўнае страхаванне жыцця і здароўя асоб, якіх ахоўваюць, распаўсюджваецца і на іх блізкіх у перыяд выкарыстання да іх мер бяспекі.

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАБЕЛЫ

Сенатары ўхвалілі законапраект аб змяненні заканаў па пытаннях сродкаў масавай інфармацыі.

Законапраект накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне поўнай і пэўнай інфармацыі, абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў у сферы масавай інфармацыі, нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы.

— Практыка выкарыстання заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі паказала, што ў нас ёсць пэўныя недахопы, якімі, на жаль, карысталіся нашы нядобрасумленныя калегі. Змены, якія сёння былі прыняты членамі Савета Рэспублікі, якраз накіраваны на ліквідацыю гэтых недахопаў або вузкіх месцаў у заканадаўстве, — падкрэсліў у размове з журналістамі **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

Паводле яго слоў, законапраект накіраваны на процідзеянне распаўсюджванню фэйкавай інфармацыі і ўвядзенне адказнасці журналіста за такія дзеянні.

Праектам закона таксама прапануецца дадатковa даць Міністэрству інфармацыі права прыняцця рашэння аб спыненні выпуску СМІ (пасам з судом пры наяўнасці адпаведнага рашэння Міжведамасчай камісіі па бяспецы ў інфармацыйнай сферы пры Савеце бяспекі Беларусі).

— У эпоху, калі карціна дня фарміруецца нават не за дні, а за пачаын гадзіны, гэта ўплывае на грамадскую думку, падаяючае нашых грамадзян да дзеяння. Мы не можам сабе дазволіць чакаць рашэння суда, бо на разбор можа сысці не адзін і не два месяцы. Да таго ж гэта не галаслоўна, гэта заўсёды мае пад сабой пэўную глебу, адлаведнае хадайніцтва кампетэнтных органаў, — падкрэсліў міністр.

Акрамя таго, законапраектам пашыраецца пералік асоб, якія не маюць права выступаць заканавальнікамі СМІ; удакладняюцца падставы для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі (перарэгістрацыі) СМІ; пашыраюцца падставы для адмовы з выдачы дазволу на распаўсюджванне ў Беларусі прадукцыі замежнага СМІ; уводзяцца абавязкі юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ; карэкціруецца прававы статус журналіста; прадугледжваецца магчымасць пазбаўлення журналіста акрэдытацыі; пашыраецца пералік інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена; спрашчаецца прынятае рашэнне аб спыненні выпуску СМІ. Таксама ўдакладняюцца асаблівасці выкарыстання спасылкі на крыніцы інфармацыі і ўдасканальваюцца правілы абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсаў, сеткавых выданняў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«МЫ НАСТРОЕНЫ ДАЛЕЙ НА КАНСТРУКТЫЎНУЮ РАБОТУ З МАЛДОВАЙ»

Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Малдовы ў Беларусі Віктарам САРАЧАНАМ.

Па яго словах, паміж краінамі летась склаўся добры тавараабарот у 200 мільёнаў долараў. «Але самае галоўнае, што гэты год добра пачалі — за студзень–люты 23-працэнты рост тавараабароту. Ёсць і праблемныя пытанні. Нам неабходна адналяжць пасяджэнні міжпарадавай камісіі, апошняе было ў 2018 годзе ў Кішынёве. Важна, каб і дэпутаты Беларусі і Малдовы бралі ўдзел у пасяджэннях», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён звярнуў увагу на патэнцыял рэгіянальных сувязяў, значнасць каапэрацыйных праднрыемстваў па зборцы беларускіх трактароў, тралейбусаў у Малдове.

«У нас даўняя сяброўскія адносіны з Рэспублікай Малдова і прынцыпова важна, што гэтыя адносіны будуюцца на прынцыпах раўнапраўя, даверу, узаемнай павагі. Створана дастойная дагавора-прававая база — больш чым 85 дакументаў рознага ўзроўню», — сцвярджае спікер ніжняй палаты парламента.

Важна, што і міжпарламенскія адносіны краін на дастатковa высокім узроўні, лічыць Уладзімір Андрэйчанка. «Вы ўдзяляеце ўвагу міжпарламенцкім адносінам, — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Я думаю, на будучае нам неабходна распрацаваць нейкую дарожную карту па выкананні пагадненняў».

Віктар Сарачан, у сваю чаргу, пагадзіўся, што сумесную работу неабходна актывізаваць — час мяняецца хутка і паспявай за ім немагчыма.

«Вы правы, што пандэмія паўплывала на рух наперад, асабліва ў эканоміцы. Граніцы былі перакрытыя. Я таксама ўдзячны кіраўніцтву Беларусі за дапамогу, калі ўзнікла складаная сітуацыя з вяртанненм нашых грамадзян з усіх куткоў свету, — дадаў пасол. — Тут быў створаны своеасаблівы хаб па размеркаванні пасажырапатокаў, калі мы збіралі людзей з усяго свету, фарміравалі групы для перавозкі людзей».

Ён адзначыў, што існаванне беларускіх зборачных пляцовак прыносіць новыя рабочыя месцы для малдаван. «Нам неабходна развівць зборачную вытворчасць у Гагаузіі па трактарах. Пакуль там збіраюцца трактары малой магутнасці, але ўжо ёсць патрэба ў зборцы больш магутных трактароў. Я размаўляў з кіраўніцтвам трактарнага завода ў Мінску на гэты конт, і ёсць разуменне. Калі нам удасца сабраць міжурадавую камісію, гэтае пытанне можна ставіць там», — мяркуе кіраўнік знешнепалітычнага прадстаўніцва Малдовы.

Марыя ДАДАЛКА.

Наша пазіцыя

ЦІ БУДЗЕ ВЫРАЗНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА АДНОСІН?

Беларусь гатовая прыняць амерыканскага пасла Джулі Фішэр у любы час

Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ у эфіры тэлеканала АНТ.

Паводле слоў кіраўніка МЗС, выклікае пэўнае здзіўленне, што назначаны пасол, наведваючы Вільнюс, Варшаву, іншыя гарады, робіць пэўныя заявы. «У той жа час нашы партнёры не даюць да канца выразнага адказу адносна таго, у якім статусе спадарыня пасол мае намер прыбыць у Беларусь. Гаворыць толькі аб жаданні ўстанавіць прамыя кантакты на афіцыйным узроўні, — сказаў Уладзімір Макей. — Мы таксама зацікаўлены ў адначленні прамых кантактаў, мы лічым, што дыялог — гэта тое, што вельмі неабходна ў любых сітуацыях. Мы гатовыя прыняць амерыканскага пасла ў любы час, але мы хочам мець выразную і зразумелую перспектыву нашага далейшага ўзаемадзеяння па ўсіх напрамках з нашымі амерыканскімі партнёрамі».

Міністр адзначыў, што наша краіна зацікаўлена ў нармальных, рэгулюемых адносінах з ЗША ва ўсіх сферах. «Але мы не прымаем пэўныя метады, спробы аказаць ціск на Беларусь, наважна, ад каго б яны ні зыходзілі. І тут падзеі апошніх дзён сапраўды вымушаюць яшчэ раз, паўторна прааналізаваць стан нашых адносін з гэтай буйнейшай дзяржавай свету і паглядзець, што і хто стаіць за спробай арганізацыі дзяржаўнага перавароту ў Беларусі, як пра гэта было сказана на лініі спецслужбаў», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Беларусь зацікаўлена і ў выбудоўванні якасных адносін з Украінай, заявіў міністр замежных спраў.

«На працягу многіх стагоддзяў нашы народы жылі ў міры, дружбе і згодзе. Беларускі бок ніколі не зробіць падобнага кштатлу заяў і канкрэтных дзеянняў адносна таго, каб растравіць адносіны з украінскім народам на паўзу, гэтага не будзе ніколі. І тыя штучныя рэчы, заявы адносна таго, што нібыта з тэрыторыі Беларусі выходзіць нейкая пагроза для Украіны, абсалютна беспадстаўныя. І, хутчэй за ўсё, мэта іх складаецца ў тым, каб знайсці нейкія апраўданні самім не вельмі разумным крокам і дзеянням», — выказаў свае меркаванні Уладзімір Макей.

Марыя ДАДАЛКА.

ПЕРАХОДЗІЦЬ АД СЛОЎ ДА СПРАЎ

Зарэгістраваная асацыяцыя «Інфармацыйная бяспека» правядзе дыскусійную пляцоўку «Інтэрнэт — без наркотыкаў!»

Мадэратарам абмеркавання выступіў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы, старшыня зноў створанай асацыяцыі Сяргей КЛІШЭВІЧ.**

Асацыяцыя «Інфабяспека» зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі крыху больш за месяц таму. Яе ставрылі нашы грамадскія аб'яднанняў: «Пазітыўны рух», «Развіццё», Беларускае педагагічнае таварыства, Беларускае таварыства псіхолагаў і Беларускае грамадскае аб'яднанне дэмаграфічнай бяспекі. Мэта асацыяцыі — процідзеянне распаўсюджванню негатыўнага кантэнту ў інфармацыйнай прасторы, кансалідацыя намаганняў грамадскасці, а таксама зацікаўленых арганізацый у развіцці самарэгуляцыі інфармацыйнай супольнасці Беларусі, паведамляе афіцыйны партал Мінюста.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікі міністэрстваў унутраных спраў, інфармацыі, адукацыі і лідары грамадскіх аб'яднанняў.

Старшыня праўленя Беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» Ірына СТАТКЕВІЧ пераканана, што для вырашэння праблемы нарказпажывання вельмі важна знайсці ключавыя словы і пазначыць асноўныя прынцыпы работы, інакш будзе шмат рухаў, але мала плёну. Яна звярнула ўвагу на тое, чаму падлеткам падабаецца бавіць свой вольны час у гандлёва-забаўляльных цэнтрах, і распавяла, як у некаторых школах спрабуюць ствараць пляцоўкі з падобнай атмасферай. «Рамантычны інтэр'ер, магчымасць зарадзіць смартфон, бясплатны Wi-Fi, спартыўная інфраструктура (варкаўт-пляцоўкі), недарагія ежа і напоі», — пералічыла прывабныя для старшакласнікаў элементы Ірына Статкевіч і заклікала на гэты ўзор прапаноўвць жывыя ідэі, якія ідуць ад патрэб маладых людзей. Для прафілактыкі наркаспажывання яна прапанавала стварыць бясплатнае асяроддзе, якое будзе развівць молодзь і адлавядаць высокаму ўзроўню камфорту.

Ад іншых спікераў таксама гучалі ідэі выкарыстоўваць FM-станцыі, папулярных блогераў, сацыяльную рэкламу. Казалі і па заканадаўства, у прыватнасці, пра такое паняцце як малазначнасць у сферы наркаспажывання.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар Марзалюк прапанаваў як мага хутчэй пераходзіць ад слоў да выразна вывераных дзеянняў.

«Павінна быць сістэмнае ўзаемадзеянне ўсіх зацікаўленых органаў улады, МУС і грамадскіх ініцыятыў, — падкрэсліў ён. — Важна таксама, каб наша размова не засталася «парадняй».

Яго калега па камісіі Сяргей Клішэвіч прапанаваў з усяго сказанага падчас дыскусіі стварыць дакумент-дарожнік — дарожную карту, а таксама ў далейшым спытаць у саміх дзяцей, чаго хочуць яны і як бачаць пазначаную праблему. Ён назваў першае пасяджэнне асацыяцыі гістарычным і, як ён старшыня, паабяцаў зрабіць усё, каб услед за дыскусіяй з'явіліся канкрэтныя рашэнні і станоўчы эфект.

Данііл СКАРАПАНАЎ.

РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЎСІХ

У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з дэлегацыяй прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ у Беларусі. У мерапрыемстве, акрамя дэпутатаў ніжняй палаты парламента і прадстаўнікоў ЮНІСЕФ, паўдзельнічалі супрацоўнікі Міністэрства адукацыі. На сустрэчы абмяркоўвалі развіццё і ўкараненне інклюзіўнай адукацыі, забеспячэнне правоў дзяцей з інваліднасцю і асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Таксама прадстаўніцтва ЮНІСЕФ унесла прапановы ў новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі.

«Тэма інклюзіўнай адукацыі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (не толькі дзяцей, але і дарослага насельніцтва) невыпадковая. Яна вельмі важная ў рамках таго, што ў нашай прафільнай камісіі на падрыхтоўцы да другога чытання знаходзіцца праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, у якім вельмі вялікае месца адводзіцца менавіта пытанням інклюзіўнай адукацыі. Важным з'яўляецца факт, што ў праект кодэкса ўключаны тэрміны, якія дазволяць удасканальваць ва ўстановах адукацыі ўмовы для бездар'ернага асяроддзя, для адукацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і вучняў, якія маюць асаблівыя патрэбы», — сказала **Ірына РЫНЕЙСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў.**

Яна падкрэсліла, што пры падрыхтоўцы абнаўленняў у Кодэкс аб адукацыі былі вывучаны нарматыўныя дакументы па інклюзіўнай адукацыі розных краін.

«Мы сёння гаворым не аб прарыўных навацыях, а пра ўдасканаленне ўмоў, таму што ў нашай краіне за апошнія гады яны створаны. Цяпер стаіць пытанне аб іх удасканаленні. На жаль, варта адзначыць той факт, што колькасць асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця не памяншаецца. Таму мы павінны гэтую катэгорыю ўключаць у адукацыйны працэс перш за ўсё са здаровымі аднагодкамі, для таго каб яны лепш сацыялізаваліся ў жыццё, адчувалі сябе паўнавартаснымі членамі грамадства», — заявіла дэпутат.

Парламентарый адзначыла, што супрацоўніцтва з ЮНІСЕФ па пытаннях інклюзіўнай адукацыі, роўнага доступу да навучання асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, абароны правоў дзіцяці ідзе не першы год у рамках праграмных дакументаў. Партнёрства, па словах Ірыны Рынейскай, нацэлена на рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў, ахову жыцця і здароўя дзяцей у нашай краіне.

Данііл СКАРАПАНАЎ.

ЯК ЗВЯЗАНЫ ПАНДЭМІЯ І ГЕНДАРНЫЯ ПРАБЛЕМЫ?

Дэпутаты бяруць удзел у шэрагу відэаканферэнцый у рамках Міжпарламенцкага дыялогу, прысвечаных адналенню пасля COVID-19 з улікам гендарных фактараў. Серыя з трох анлайн-сустрэч, арганізаваных Міжпарламенцкім саюзам і структурай «ААН-Жанчыны», пачалася тэмай «Пашырэнне эканамічных правоў і магчымасцяў жанчын». На гэтым тыдні парламентарыі разглядалі праблему «гвалту ў адносінах да жанчын і дзяўчынак». Падчас сустрэчы ўдзельнікі абмянялися вопытам па супрацьдзеянні насіллю, абмеркавалі магчымасці па прасоўванні гендарнай роўнасці. Гэтыя праблемы сталі яшчэ больш актуальныя з-за ўздзеяння коваду — меры па ізаляцыі і эканамічны ціск яшчэ больш узмацнілі гнаят у дачыненні да жаночага полу.

Паводле меркавання арганізатараў відэасустрэч, парламенты маюць унікальную магчымасць распрацаваць заканадаўства, якое ўлічвае гендарныя аспекты, а таксама мабілізаваць грамадства ў адначленні пасля пандэміі з улікам гендарных фактараў.

«Мы разумеем, што пандэмія закранула ўсе краіны свету, і перадусім пакутавалі ад гэтага самыя ўразлівыя слаі насельніцтва. На жаль, жанчыны дасюль застаюцца ўразлівыя. У многіх краінах свету жанчыны абмежаваны ў эканамічным правах — заробкаю менш, займаюць менш значныя пасады, таму ад пандэміі яны пацярпелі больш. Таксама жанчыны працуюць у сферы аслугоўвання, гандлі — галінах, што адчулі значны негатыўны ўплыў пандэміі», — сказала **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Марына ШКРОБ.** Па яе словах, жанчыны апынулися на перадавой барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй яшчэ і таму, што вялікая колькасць людзей гэтага полу працуе ў медыцыне.

Як дадала дэпутат, наша краіна не ўводзіла лакдаўн, таму гендарныя праблемы, звязаныя з эканамічнымі наступствамі пандэміі, закранулі беларусак не так значна.

«Але тым не менш, некаторыя прадпрыемствы закрыліся, крыху паменшыўся гандаль, значна пацярпелі сфера прыгажосці і жанчыны, якія задзейнічаны ў гэтых сферах. Таму ўрад прымаў меры, каб падтрымаць менавіта гэтыя галіны», — падкрэсліла Марына Шкроб.

На яе думку, тэма гвалту ў сям'і, якая абмяркоўвалася падчас відэасустрэчы, ніколі не сыходзіць з парадку дня.

«Любы гвалт павінен быць спынены, ні ў якім разе нельга глядзець на гэта абыякава. Але кажучы пра нашу краіну і параўноўваючы яе з іншымі, мы разумеем, што нашы жанчыны не былі зачыненыя ў дамах, дзе не маглі папрасіць дапамогі. А для іншых краін гэта праблема была вельмі важная, таму і стала тэмай абмеркавання», — заявіла парламентарый.

Сустрэча ў межах Міжпарламенцкага дыялогу па гендарна-чулых праблемах прайшла ўчора. Яе тэма — «Парламенты, якія ўлічваюць гендарныя аспекты, і прававыя рэформы, якія ўлічваюць гендарныя аспекты».

Марыя ДАДАЛКА.

Сведения о результатах проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner и Mastercard»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089 г. Минск, пр-т Дзержинского, 5–613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Сроки проведения рекламной игры:
срок начала рекламной игры: 12.02.2021;
срок окончания рекламной игры 15.05.2021.

3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3930 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 27.01.2021.

4. Количество участников рекламной игры – 174 чел.

5. Информация о призовом фонде:
размер призового фонда рекламной игры составляет 6849 (шесть тысяч восемьсот сорок девять) белорусских рублей 43 (сорок три) копейки. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

6. Информация о победителях рекламной игры:

№ п/п	Фамилия, инициалы победителя	Сведения о выигрыше
1	Петрушин И.В.	Приз (тур № 1) – смартфон Apple iPhone 12 64GB (PRODUCT) RED, Model A2403, MGJ73RM/A, денежные средства в размере 425,71 бел. руб.
2	Павловский А.С.	Приз (тур № 2) – смартфон Apple iPhone 12 64GB (PRODUCT) RED, Model A2403, MGJ73RM/A, денежные средства в размере 425,71 бел. руб.

8. Для получения призов победители должны явиться в течение 15.05.2021 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

Извещение о проведении 13 мая 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
«Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212
Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17
Начальная цена – 874 561,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 87 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.
Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 13 мая 2021 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 23.04.2021 по 07.05.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Информация о выплате дивидендов по акциям ОАО «Лукомльэнергомонтаж»

Полное наименование и местонахождение акционерного общества	ОАО «Лукомльэнергомонтаж», 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район
Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям	16.04.2021 г.
Дивиденды, начисленные на одну простую (обыкновенную) акцию	1,61168 бел. руб.
Срок выплаты дивидендов по акциям	не позднее 60-ти дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов в денежной форме
Порядок выплаты дивидендов по акциям	Дивиденды перечисляются: работникам акционерам – путем перечисления на их карт-счета в БПС-Сбербанк; неработающим акционерам – почтовым переводом по письменному заявлению или перечислением на банковский счет при предоставлении полной информации за счет средств Общества. Для акционеров, не предоставивших уточненной информации о реквизитах своих счетов в банке или адресных данных, срок выплаты дивидендов автоматически продлевается по мере ее предоставления: в данном случае дивиденды перечисляются не позднее 60 календарных дней с момента получения Обществом такой информации от акционеров.

УНП 300007839

Информация о намерении ОАО «Лукомэнергомонтаж» осуществить приобретение ранее выпущенных (обыкновенных) акций собственного выпуска

Предложение о покупке акций

Полное наименование и местонахождение покупателя акций: открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»; Республика Беларусь, 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район. Контактный телефон покупателя акций: 8 (02133) 60273.

Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»; Республика Беларусь, 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении: – для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общего количества.

Количество приобретаемых акций – 3000 штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции, отчуждаемые акционерами Общества: 15,00 (пятнадцать) белорусских рублей 00 копеек за одну акцию.

Срок, форма и порядок оплаты акций:
• оплата приобретаемых акций осуществляется покупателем акций в срок не позднее 60 (шестьдесяти) календарных дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» покупателя акций, путем безналичного перечисления денежных средств (белорусских рублей) на банковский счет продавца акций;
• переход акций со счета «депо» продавца акций на счет «депо» покупателя акций осуществляется продавцом акций в день регистрации договора купли-продажи акций депозитарием покупателя акций путем предоставления в депозитарий поручения «депо» на перевод ценных бумаг.

Адрес заключения договоров купли-продажи акций: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район ОАО «Лукомльэнергомонтаж».

• Дата начала и окончания срока представления акционерами предложений о продаже акций: с 01 мая 2021 года по 31 июля 2021 года.

• Дата начала и окончания срока покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций): с 01 августа 2021года по 30 сентября 2021года.

Расходы, связанные с регистрацией сделок по приобретению Обществом акций собственного выпуска и списания акций со счета «Депо» продавца несет Общество в полном объеме.

УНП 300007839

Брагінскія кавуны з прыстаўкай «эка-»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«На дадзеным участку мы плануем апрабаваць тэхналогію вырошчвання кавуноў з расады, будзем укараняць прымяненне кропельнага паліву, спанбандзіравання, а ўжо ў працэсе вызначым і падключым новыя неабходныя тэхналогіі ў вырошчванні гэтай культуры», — тлумачыць **дырэктар мясцовага фонду падтрымкі прадпрымальніцтва і сельскага развіцця «Эка-Інавацыя» Алена МАЛОЧКА.** Кіраўнік фонду сама прайшла шлях ад уласнай падсобнай гаспадаркі да фермерскай. Кажа, калі яе сям'я вырашыла заняцца аграбізнесам, думалі, што ўсё ведаюць. Аказалася, трэба вучыцца. Паступова не толькі самі асвоілі новыя тэхналогіі, але на базе фонду «Эка-Інавацыя» пачалі арганізоўваць вучобу, майстар-класы, трэнінгі, вэбінары з удзелам дасведчаных спецыялістаў. Цяпер сямейны аграбізнес Малочкаў — гэта доследныя ўчасткі: яблыневы сад, парэчкавая плантацыя, участкі пад капусту, зяленіва, кукурузу, цяплічныя агуркі і памідоры. Усё па найноўшых энергазберагальных тэхналогіях. Па такой жа мадэлі на Брагіншчыне працуе некалькі дзясяткаў сем'яў. Але, безумоўна, у раёне фермерам мала жадаць працаваць на зямлі, трэба яшчэ даказаць, што іх сельгаспрадукцыя «чыстая».

Сёлета на базе фонду ў Брагінскім раёне пачалі працаваць курсы для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, дзе іх вучаць вырабляць экалагічную прадукцыю. У праекце «Аграбізнес-інкубатар» паўдзельнічаць можа кожны, галоўнае — жаданне працаваць на зямлі. Ход рэалізацыі кожнага праекта строга кантралюецца, таму атрымаць дапамогу і нічога не зрабіць — немагчыма.

— Выходным пунктам новага праекта стала распрацоўка Праграмы развіцця сельскага малога бізнесу Брагінскага раёна Гомельскай вобласці на перыяд да 2025 года. Яе ключавое звяно — аграбізнес-інкубатар як сацыяльнае прадпрыемства, што аказвае звыш 35 відаў паслуг не толькі сялянскім і фермерскім, але і асабістым падсобным гаспадаркам раёна, — адзначае Алена Малочка. — Прадугледжана інфармацыйнае суправаджэнне, захаванне і перапрацоўка прадукцыі, выдзяленне ў арэнду тэхнікі (ідзе стварэнне машынна-трактарнага парку) — трактароў цягавага класа, ягадаўборачных камбайнаў для уборкі ўраджаю парэчак і буякоў.

Алена Фёдараўна тлумачыць, што ўвогуле ў рамках праекта рэалізуюць некалькі напрамкаў. Так, у школе сельскага прадпрымальніка праходзіць навучанне ад азоў бізнесу да яго ўстойлівага вядзення. Школа — мабільная, можа працаваць у любым населеным пункце раёна. У якасці запрошаных на трэнінгі экспертаў выступаюць прадстаўнікі падатковай службы, падраздзялення райвыканкама, вопытныя прадпрымальнікі.

— Лідарамі могуць быць і нязўзнёненыя ў сабе, закамплексаваныя, магчыма, зламаныя жыццёвымі абставінамі людзі. Навучыць можна ўсіх, але галоўнае, каб было жаданне вучыцца, каб чалавек ішоў на кантакт, не баяўся мяняцца, — дзеліцца вопытам выкладання ў рэчышчы развіцця сельскага турызму **бізнес-трэнер, прадпрымальнік Аксана ПАДОЛЬСКАЯ.**

Між тым, паспрабаваць свае сілы прадпрымальнікі могуць у розных справах. У школе сельскага турызму навучаць, як адкрыць аграсядзібу, арганізаваць аграгурыстычны маршрут, развіваць цяплічнае агародніцтва, пладаводства, рамесніцтва, жаночае прадпрымальніцтва.

